■ Парламенцкі дзённік

# ВІЗІТ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ У ШВЕЙЦАРЫЮ ЗАПЛАНАВАНЫ Ў КАНЦЫ ЛЮТАГА

**Пра гэта паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка. Падчас візіту плануецца абмеркаваць шэраг пытанняў, якія датычацца ў тым ліку гандлю, інвестыцый і гуманітарнага супрацоўніцтва. Гэта спікер ніжняй палаты парламента адзначыў на сустрэчы са старшынёй камітэта па знешняй палітыцы Савета кантонаў Федэральнага сходу Швейцарыі, сустаршынёй групы сяброўства «Швейцарыя — Беларусь» Філіпа Ламбардзі.**

«Рэспубліка Беларусь надае вялікае значэнне развіццю канструктыўных адносін са Швейцарскай Канфедэрацыяй. У нас няма на сённяшні дзень нявырашаных праблемных пытанняў у плане двухбаковага супрацоўніцтва. Мы лічым, што ў нас ёсць вялікі патэнцыял для развіцця гэтага супрацоўніцтва. І мы адкрытыя для шырокага дыялогу па любых напрамках», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама звярнуў увагу на тое, што партнёрства Беларусі і Швейцарыі ў міжнародных арганізацыях наладжана плённа. Дарэчы, Філіпа Ламбардзі растлумачыў, што на стварэнне групы сяброўства ў швейцарскім парламенце паўплывала сустрэча падчас сесіі ПА АБСЕ, якая праходзіла ў Мінску.

Пасля афіцыйнай сустрэчы ў парламенце адбыўся таварыскі матч паміж камандай Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і ветэранамі швейцарскага хакейнага клуба «Амбры-Піёта», які ўзначальвае Філіпа Ламбардзі. Матч закончыўся з лікам 11:4 на карысць каманды Прэзідэнта. Але ёсць надзея на рэванш: швейцарцы запрасілі правесці матч у адказ на сваёй тэрыторыі.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

■ Юбілей

# ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ СЛАЎНЫХ СПРАЎ

**У Магілёве ўрачыста адзначылі 80-гадовы юбілей вобласці**

— Магілёўская вобласць валодае магутным патэнцыялам і добрымі перспектывамі для развіцця, — адзначыў падчас урачыстага мерапрыемства **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Сёння рэгіён упэўнена глядзіць у будучыню, рэалізуе сур'ёзныя прамысловыя і інавацыйныя праекты. Маштабная мадэрнізацыя ідзе на «Белшыне», перадавыя распрацоўкі ўкараняюцца на прадпрыемствах «Магатэкс», «Магілёўхімвалакно». Можна прывесці яшчэ шмат станоўчых прыкладаў. І ва ўсім гэтым вялікая заслуга кіраўніцтва вобласці, прадпрыемстваў і спецыялістаў рэгіёна.

Міхаіл Мясніковіч уручыў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміру Даманеўскаму Падзяку Прэзідэнта працаўнікам Магілёўскай вобласці за значны ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці і ў сувязі з 80-годдзем з дня ўтварэння Магілёўскай вобласці *(на фота).*



Фота БЕЛТА.

— У гэтыя юбілейныя дні мы з гонарам успамінаем пра тое, што з савецкі перыяд 113 ураджэнцаў Магілёўскага краю сталі Героямі Сацыялістычнай Працы. Паспехі цяперашняга перыяду сталі працягам традыцый мінулых пакаленняў, — адзначыў Уладзімір Даманеўскі. — Спрыяльнае інвестыцыйнае асяроддзе за апошнія пяць гадоў дало магчымасць прыцягнуць у вобласць каля паўтара мільярда долараў замежных інвестыцый, з іх 950 мільёнаў — прамых. Сёння ў вобласці рэалізуецца каля 50 буйных інвестыцыйных дагавораў, падтрымліваюцца гандлёва-эканамічныя адносіны са 116 краінамі свету. Толькі за мінулы год мы выйшлі на 9 новых рынкаў.

Удзел у святочных урачыстасцях прынялі дэлегацыі Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы, Бранскай і Ленінградскай абласцей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

# СІСТЭМУ АПЛАТЫ ПРАЦЫ ПЕРАГЛЕДЗЯЦЬ,

## а прадпрыемствы з запазычанасцю па заробках возьмуць на кантроль

**«Задача на 2018 год — пераламаць сітуацыю на рынку працы, выйсці на рост занятых у эканоміцы. Уся нарматыўна-прававая база, у тым ліку пакет па лібералізацыі эканомікі, дазволіць нам дабіцца большай актыўнасці насельніцтва. Разам з заяўным прынцыпам будзе працаваць выяўны — мы самі ідзем да людзей», — адзначыла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ падчас выніковай калегіі ведамства. У цэнтры ўвагі аказаліся пытанні занятасці, заробкаў у бюджэтнай сферы і сектары «бальнічных».**

### Спрагназаваць патрэбу ў кадрах

Меры, якія прымаліся летась службамі занятасці, далі станоўчы эфект. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 лютага 2018-га склаў 0,5 працэнта. У ніводным раёне ён не перавысіў аднаго працэнта, хоць год таму быў вышэйшы ў 110 рэгіёнах. Найменнымі заяўлена 54 тысячы свабодных месцаў — у паўтара раза больш, чым на пачатак мінулага года.

Акцэнты ў рабоце на бягучы год вызначыў Дэкрэт № 1. Гэта індывідуальны падыход у вырашэнні праблемы працаўладкавання, стварэнне новых прадпрыемстваў, захаванне калектываў. Па кожным рэгіёне будзе зацверджаны план далейшых мер, падмацаваны фінансавымі рэсурсамі з мясцовага бюджэту. Нягледзячы на тое, што заданні даведзены на квартал, міністэрства будзе кожны месяц праводзіць дэталёвы маніторынг па шырокім спісе паказчыкаў. Вынікі першага квартала разгледзяць у канцы красавіка на калегіі ведамства.

Новым кірункам дзейнасці стане прагназаванне патрэбы эканомікі ў кадрах. На падставе гэтай інфармацыі Міністэрства адукацыі будзе фарміраваць кантрольныя лічбы прыёму ў навучальныя ўстановы.

Вырашэнне пытанняў рынку працы — задача не толькі службаў занятасці.

— Неабходна кансалідацыя ўсіх структурных падраздзяленняў мясцовых выканаўчых органаў улады, асабліва з камітэтамі эканомікі — у зоне іх адказнасці знаходзіцца развіццё малога бізнесу, дзе ствараецца больш за 50 працэнтаў працоўных месцаў, — лічыць Ірына Касцевіч.

### Што будзе з заробкамі бюджэтнікаў?

З 1 студзеня 2019 года будзе перагледжана сістэма аплаты працы ў бюджэтным сектары. Прапануецца замяніць 27-разрадную тарыфную сетку на 17-разрадную, а тарыфную стаўку — на базавую, памер якой будзе прыроўнены да бюджэту пражытачнага мінімуму. У планах таксама адмяніць шматлікія цэнтралізавана ўстаноўленыя выплаты, пашырыць правы кіраўнікоў дзяржорганаў і бюджэтных арганізацый па тарыфікацыі пасад з улікам галіновых асаблівасцяў, размежаваць паўнамоцтвы дзяржорганаў і бюджэтных арганізацый у галіне аплаты працы.

У лютым трэба будзе ўзгадніць адпаведныя ўказы кіраўніка краіны і пастановы ўрада з усімі галіновымі ведамствамі і прафсаюзамі і да 1 сакавіка ўнесці ва ўрад.

Па словах Ірыны Касцевіч, забеспячэнне балансіроўкі з прадукцыйнасцю і павышэнне заробкаў бюджэтнікаў — адны з найважнейшых кірункаў работы ведамства. «Летась таксама быў прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, якія дазволілі павысіць заработныя платы ў бюджэтным сектары, — рэальны тэмп росту склаў 104 працэнты. Мы некалькі разоў павялічвалі тарыфную стаўку першага разраду, закранулі нізкааплатныя катэгорыі — тых, хто аказвае сацыяльныя паслугі, працуе ў галіне культуры і іншых. У выніку суадносіны намінальнага заробку ў бюджэтнай сферы (у студзені—снежні ён раўняўся 619 рублям. — **Аўт.**) і ў цэлым па краіне склалі 76 працэнтаў. Задача 2018 года — павысіць да 80 працэнтаў».

### Збалансаваць даходы і расходы

Заклапочанасць міністэрства выклікае рост выдаткаў на выплату дапамогі па часовай непрацаздольнасці.

— Асабліва ён заўважны ў Мінскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Мяркую, сумесна з органамі аховы здароўя неабходна правесці сур'ёзны аналіз прычын павелічэння паказчыка часовай непрацаздольнасці і прадумаць адпаведныя меры, — пракаментавала Ірына Касцевіч.

Яна паведаміла таксама, што летась сума паступленняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва склала 12,4 мільярда рублёў, тэмп росту — 109 працэнтаў. Для забеспячэння своечасовага фінансавання ўсіх выдаткаў прыцягваліся сродкі рэспубліканскага бюджэту ў памеры амаль 519 мільёнаў. Для збалансаванасці даходаў і расходаў ФСАН актыўна працаваў з даўжнікамі. У выніку запазычанасць у бюджэт фонду па плацяжах знізілася на 21 мільён.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Медыяпрастора

# СМІ ПАВІННЫ КАНСАЛІДАВАЦЬ ГРАМАДСТВА

## Міністэрства інфармацыі плануе засяродзіць асаблівую ўвагу на інтэрнэт-прасторы і сацыяльных сетках

**Учора на калегіі Міністэрства інфармацыі былі падведзены вынікі работы ў 2017 годзе і агучаны прыярытэты дзейнасці на 2018-ы. Адной з актуальных тэм было далейшае развіццё інтэрнэт-прасторы ў нашай краіне.**

І гэта невыпадкова. Па словах **міністра інфармацыі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА,** грамадзян непакоіць змяставе напаўненне інтэрнэт-рэсурсаў, усёдазволенасць у ацэнках і выказваннях у сеціўнай прасторы. Пра гэта сведчыць аналіз зваротаў ад людзей розных палітычных поглядаў і сацыяльнага статусу.

У той жа час міністр заўважыў, што гэта не азначае далейшую забарону на навіны з сеціва. Кантроль будзе датычыцца заканадаўчай ацэнкі змястоўнай часткі публікацый.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Калі інстытуты — як дзяржаўныя, так і грамадскія — не парушаюць закон, калі яны дзейнічаюць для кансалідацыі грамадства ў дасягненні здаровых сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных задач, то прэтэнзій да іх быць не павінна, — зазначыў Аляксандр Карлюкевіч.

Міністр таксама паведаміў, што працягваецца работа па распрацоўцы праекта закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь», распачатая летась. Праект прадугледжвае глабальную карэкціроўку закона «Аб сродках масавай інфармацыі», а таксама кропкавыя дапаўненні і змяненні ў іншыя дакументы. Быў выкарыстаны і міжнародны вопыт у гэтай сферы.

— Мы вымушаны выпрацаваць навыкі бяспечнага ўзаемадзеяння з віртуальнай прасторай. Прэзідэнт ужо звярнуўся да творчай эліты з заклікам узяць пад кантроль працэсы, якія адбываюцца ў інтэрнэце, не перашкаджаць, — гэта немагчыма, — а прыстасавацца і навучыцца выкарыстоўваць мноства інфармацыйных крыніц, — сказаў міністр. — Будзем шукаць традыцыі, вопыт, якія павінны прыйсці з друкаваных СМІ ў сацыяльныя сеткі, новыя медыя. Кожная рэдакцыя, у тым ліку і раённай газеты, павінна стаць мультымедыйным цэнтрам, дзе будуць выкарыстоўвацца differentiate рознабаковыя тэхналогіі ў адносінах з чытачом.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** звярнуў увагу на актыўнасць журналістаў у інтэрнэт-прасторы:

— Трэба падаваць інфармацыю цікава, не прыпадабняючыся адно да аднаго. Кожны рэсурс павінен прапаноўваць наведвальніку нешта асаблівае, арыентавацца на пэўны сегмент грамадства. Мясцовая прэса мусіць не падстройвацца пад інтарэсы рэгіянальных чыноўнікаў, а паказваць асаблівасці мясцовага жыцця, пісаць пра людзей і тыя праблемы, якія іх хвалююць. Акрамя таго, трэба павялічваць аб'ём кантэнту ўласнай вытворчасці — гэта датычыцца ў першую чаргу беларускага тэлебачання. Такім чынам будзе ўмацоўвацца суверэнітэт краіны, ісці папулярызацыя нацыянальных каштоўнасцяў.

«Мініфарму неабходна ўсебакова прааналізаваць пытанні выдавецкай дзейнасці», — паставіў задачу **намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО**. У сістэме міністэрства шэсць выдавецтваў, у многіх ведамстваў ёсць свае рэдакцыйна-выдавецкія цэнтры — іх ужо больш за 130. «Таму трэба дэталёва вывучыць, як загружаныя выдавецтвы, якія кнігі выдаюцца, наколькі яны запатрабаваныя, іх сабекошт, рэнтабельнасць», — даручыў Васіль Жарко.

Віцэ-прэм'ер прапанаваў адкрыць новыя магазіны і кіёскі з друкаванай прадукцыяй, праводзіць папулярызацыю чытання сярод дзяцей. Таксама ён параіў СМІ больш увагі ўдзяляць прапагандзе здаровага ладу жыцця, сямейных каштоўнасцяў, ствараць адукацыйны кантэнт для моладзі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні начальніку галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандру Іосіфавічу Ільясевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні начальніку галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандру Іосіфавічу Ільясевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**